# Адкрытая размова

***Прадстаўнікі працоўных калектываў агульнаадукацыйных устаноў Шчучына сустрэліся са старшынёй Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці Віктарам Андрэевічам Лісковічам.***



Сустрэча прайшла ў сярэдняй школе № 2 Шчучына. Зусім нядаўна тут адбыліся ўрачыстасці з нагоды завяршэння капітальнага рамонту. Школа сапраўды абнавілася, стала ўтульна ў класах, спартыўных памяшканнях і сталовай. Менавіта туды завітаў высокі госць, трапіўшы на абед вучняў малодшых класаў. В.А.Лісковіч спачатку пагутарыў з навучэнцамі 11 "Б" класа, якія ў гэты дзень дзяжурылі ў сталовай. Мікіта Змітрукевіч з сябрамі смакам школьнай ежы задаволены і адзначае, што школьныя катлеты любяць усе дзеці. Гэта пацвердзілі і навучэнцы малодшых класаў.

Віктар Андрэевіч, пагаварыўшы з вучнямі, шэф-поварам, дырэктарам школы Уладзімірам Антонавічам Жданко, падкрэсліў, што павінны ўлічвацца запыты саміх дзяцей: гатаваць трэба тое, што яны будуць з задавальненнем есці, а не ператвараць прадукты ў алходы.

Пра эксперымент па папярэднім выбары страў у школьных сталовых паведаміў начальнік аддзела адукацыі, спорту і турызму Шчучынскага райвыканкама Павел Віктаравіч Тарчынскі.

Разам са старшынёй Пастаяннай камісіі ў школе пабывалі першы намеснік начальніка галоўнага ўпраўлення адукацыі Гродзенскага аблвыканкама Галіна Уладзіміраўна Курганская, старшыня Шчучынскага раённага Савета дэпутатаў Ганна Станіславаўна Хвядзюк, намеснік старшыні райвыканкама Алена Васільеўна Пасюта. Госці азнаёміліся з арганізацыяй спартыўнай работы ў школе, забяспечанасцю спартыўным інвентаром, а таксама пабывалі на занятках па фізічнай культуры ў абноўленай спартыўнай зале.

У актавай зале сабраліся настаўнікі і кіраўнікі трох школ і гімназіі Шчучына. Віктар Андрэевіч у пачатку размовы сказаў, што ўражаны пераменамі, якія адбыліся ў сярэдняй школе № 2. Ён падзякаваў педагогам за іх высакародную працу па навучанні і выхаванні юных грамадзян краіны і падкрэсліў, што важна падрыхтаваць дзіця да жыцця, даць такую адукацыю і так сарыентаваць на прафесію, каб, атрымаўшы дыплом, выпускнік не шукаў шчасця на чужыне, а вяртаўся на сваю малую радзіму.

В.А.Лісковіч расказаў пра работу Савета Рэспублікі, выказаў сваё бачанне развіцця сістэмы адукацыі краіны.

Удзельнікаў сустрэчы хвалявалі пытанні змяненняў у Кодэкс аб адукацыі Рэспублікі Беларусь, у сістэме аплаты працы бюджэтных работнікаў, ільготных пенсій для некаторых катэгорый педагогаў, у тым ліку настаўнікаў пачатковай школы. Да размовы аб інтэграцыі выпускных экзаменаў і цэнтралізаванага тэсціравання В.А.Лісковіч папрасіў далучыцца першага намесніка начальніка галоўнага ўпраўлення адукацыі Гродзенскага аблвыканкама Г.У.Курганскую. Наогул, сустрэча была пабудавана так, каб быў пачуты кожны, у каго ёсць пытанні, хто гатовы выказаць свае думкі і прапановы па паляпшэнні сістэмы адукацыі Беларусі.

**Надзея ВАШКЕЛЕВІЧ.**
*grodna@nastgaz.by*